# Жыві, БДУ!


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР

31 КАСТРЫЧНІКА

№ 26(1690)


## ЗВАНОК З РЭДАКЦЫІ

# Іспыт трымаюць... дэканы

Не было б ніякіх праблем, калі б гэты нумар газеты рыхтаваўся 70 гадоў назад. Расказаць пра справы ўсяго двух факультэтаў не складана. ЗАРАЗ ІХ У БДУ — ДВАНАЦЦАЦЬ! І каб вы адчулі агульнауніверсітэцкі настрой, мы вырашылі зрабіць маленькае прэс-апытанне дэканаў. Вось што з гэтага атрымалася...

Валерый Мікалаевіч ГАДУНОЎ, дэкан юрыдычнага факультэта:

— *Ці мяняецца з цягам часу паняцце «юрыст»?*

— Размова, безумоўна, ідзе аб прафесійных якасцях юрыста. Назаву адну з самых важных. Мары мае — аб незалежнасці. Толькі незалежны юрыст здольны дапамагчы людзям, быць карысным не на словах, а сапраўды. На жаль, падпарадкаванасць эканамічнай і палітычнай сістэме не дае зараз рэальнай свабоды.

Альберт Мікалаевіч ЕЛСУКОЎ, дэкан філасофска-эканамічнага факультэта:

— *На Вашу думку, ад недахопу якіх ведаў — філасофскіх ці эканамічных — атрымаўся вынік, які мы бачым у цяперашнім жыцці?*

— Нельга адказаць адназначна на гэтае пытанне, бо ў рэшце рэшт усё ўзаемазвязана. Калі не будзе неабходнай матэрыяльнай базы, не атрымае неабходнага развіцця духоўны патэнцыял. І наадварот.

Я мог бы пафіласофстваваць на тэму «Чаму марксізм і сацыялізм у Расіі атрымаў найвышэйшае сваё развіццё, чаму Расія паслужыла ў гэтым выпадку месцам гістарычнага эксперыменту?»...

Мы пераканаліся, што нельга з дапамогай дэкларацый і заклікаў увесці ў краіне новы строй, наладзіць лепшае жыццё. Адзін наглядны прыклад. Я лічу, што за 70 гадоў Савецкая ўлада не зрабіла таго, што неабходна для развіцця універсітэта.

Расціслаў Афанасьевіч ЖМОЙДЗЯК, дэкан геаграфічнага факультэта:

— *Самае галоўнае адкрыццё, якое Вы зрабілі на геаграфічным факультэце за час работы тут дэканам?*

— Хваліцца не буду, але дасягненні ёсць. Падрыхтавана больш за дзесяць кандыдатаў навук, павялічылася колькасць дактароў навук, рэканструіруем свой музей, адкрылі чытальную залу геаграфічных навук, тры навукова-даследчых лабараторыі, уведзены новыя спецыялізацыі па экалогіі, добраўпарадкавалі вучэбна-геаграфічную станцыю «Заходняя Беразіна», зараз вырашаем пытанне аб павелічэнні Браслаўскай станцыі.

Віктар Іванавіч КАРЗЮК, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі:

— *Якія праблемы, згодна Вашаму прагнозу, узнікнуць у студэнтаў, якія будуць заканчваць універсітэт праз 70 гадоў?*

— Я ведаю, з чым звязана такое пытанне. Лічу, што ў хуткім часе прадпрыемствы і ўстановы будуць зацікаўлены ў тым, каб атрымаць высокакваліфікаваных, добра падрыхтаваных спецыялістаў, якіх рыхтуе наш факультэт. Будзем спадзявацца, што пад час 100-годдзя БДУ пытанняў з размеркаваннем выпускнікоў і іншых праблем не будзе.

Анатоль Пятровіч КЛІШЧАНКА, дэкан фізічнага факультэта:

— *Якія думкі пераважаюць у Вас, калі гавораць аб 70-годдзі БДУ?*

— Калі БДУ і стаў у нейкай меры ўзорам у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, то адносна матэрыяльнай базы, умоў жыцця і вучобы студэнтаў, працы і навуковай дзейнасці выкладчыкаў і супрацоўнікаў наш універсітэт флагманам пакуль што не з'яўляецца.

Алег Антонавіч ЛОЙКА, дэкан філалагічнага факультэта:

— *Алег Антонавіч, як Вы лічыце, ці хутка наш Беларускі універсітэт загаворыць на роднай мове?*

— Загаворыць, але можа не так прыгожа, як гавораць на філфаку, асабліва дзяўчаты на беларускім аддзяленні. Увогуле наш універсітэт будзе сапраўдным універсітэтам тады, калі ў ім проста, вольна загавораць не толькі на беларускай мове, але і на рускай, на польскай, на нямецкай, на украінскай... На тое мы і універсітэт, каб ведалі перш за ўсё родную мову, шанавалі яе, мілавалі, і паважалі мовы нашых суседзяў. Я спадзяюся, што гэта будзе вельмі хутка — мы яшчэ дажывём да гэтага часу.

Сцяпан Рыгоравіч МУЛЯРЧЫК, дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі:

— *Сцяпан Рыгоравіч, Вы нясеце людзям нешта канкрэтна-карыснае: прылады, машыны... Ці лічыце Вы, што праца лірыка марная?*

— Ёсць матэрыяльнае і ёсць духоўнае. Безумоўна, мы былі б больш бедныя без лірыкаў. Але я сам фізік, таму мне прасцей уявіць усю важнасць для жыцця радыёфізікі, электронікі. Натуральна, я аддаў бы перавагу, пачатак менавіта фізікам у іх вечнай спрэчцы з лірыкамі. А паэзію я люблю і вершы чытаю з задавальненнем, асабліва Ясеніна...

Леанід Платонавіч ПРЫМАЧУК, дэкан механіка-матэматычнага факультэта:

— *Ці можна запраграміраваць жыццё чалавека?*

— У кожнага чалавека свой лёс, і ён ужо даўно запраграміраваны. Я веру ў лёс!

— Алег Георгіевіч СЛУКА, дэкан факультэта журналістыкі:

— *Аб чым марыў студэнт факультэта журналістыкі Алег Слука, калі прыносіў свае журналісцкія творы ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт»?*

— Можна сказаць, была не мара, а ўпэўненасць: я вырасту. Вось менавіта ад універсітэцкай газеты да рэспубліканскага друку і нават далей, каб потым ужо самому вучыць маладых.

У свой час я шмат друкаваўся ў «БУ» і заўсёды вельмі сур'ёзна да гэтага ставіўся. Шчыміла сэрца, бо ведаў: калі надрукуюць, гэта абавязкова знойдзе водгук — прачытаюць мае аднакурснікі, калегі, сябры...

Вадзім Фёдаравіч ЦІКАВЫ, дэкан хімічнага факультэта:

— *Вадзім Фёдаравіч, экалогія — вельмі хвалюючая тэма. Ці ёсць у хімікаў нейкая вынаходка для студэнцкага духу?*

— Экалогіяй студэнцкага духу павінны займацца філолагі. У адрозненні ад іх, мы можам толькі прыдумаць якінебудзь эліксір, каб падняць тонус нашых галадаючых студэнтаў. Яшчэ было б добра вынайсці такі харч, каб есці яго можна было без відэльцаў ды лыжак (якіх не хапае ў нашых студэнцкіх сталовых). А за экалогію духу студэнтаў-хімікаў я не хвалююся — у нашых лабараторыях бактэрыі не водзяцца...

Пётр Аляксеевіч ШУПЛЯК, дэкан гістарычнага факультэта:

— *Пётр Аляксеевіч, ці можа гісторыя быць аб'ектыўнай? Чаму гісторыкі перапісваюць яе?*

— Безумоўна, можа. Гісторыя адна, яна проста існуе. Гісторыкі яе не столькі перапісваюць, колькі ўдакладняюць. Знаходзяцца новыя архіўныя матэрыялы, якія дапамагаюць нам разабрацца ў тых ці іншых з'явах. У адпаведнасці з гэтым мяняецца толькі ацэнка нейкай падзеі, а факт усё роўна застаецца фактам.

Адам Сямёнавіч ШУКАНАЎ, дэкан біялагічнага факультэта:

— *У генетыцы існуе паняцце «генафонд». Калі прымяніць гэты тэрмін да студэнцтва, то наколькі генафонд змяніўся за час існавання універсітэта?*

— Ва ўсе часы да нас прыходзілі як таленавітыя, эрудзіраваныя студэнты, нават вундэркінды, так і, адкрыта кажучы, са слабымі ведамі. Але, калі ў студэнта ёсць апантанасць, імкненне, дысцыпліна, што таксама іграе не апошнюю ролю, ён абавязкова дасягне пэўных вынікаў.

Параўноўваючы часы майго студэнцкага жыцця і цяперашняе студэнцтва, я не лічу, што адбылося нешта значнае. Таксама не лічу, што прыкмета нашага часу — гэта ўсё дрэннае.



ВЫКЛАДЧЫКІ! СУПРАЦОЎНІКІ! СТУДЭНТЫ І ВЫПУСКНІКІ! З ДНЕМ НАРАДЖЭННЯ РОДНАГА УНІВЕРСІТЭТА ВАС!

НЕЮБІЛЕЙНАЯ ГУТАРКА

**Універсітэту — не пяцьдзесят і не сто гадоў. Не больш, не менш — 70. «Не такая ўжо і круглая дата», — можна зазначыць. І запярэчыць: «І ўсё ж юбілей». Час падлічваць прыбыткі і з вышыні сталага ўзросту аналізаваць памылкі і страты.**

**Рэктар, член-карэспандэнт АН БССР Фёдар Мікалаевіч КАПУЦКІ — чалавек, якога пасада абавязвае ведаць усё, што датычыць нашай з вамі «альма матэр». Ён за яе бесперабойнае нават у крызісныя часы жыццё адказвае.**

**Дык спытаем у рэктара?**

# Рэктар Ф. М. Капуцкі:

# «Нам няма чаго саромецца...»

— Мы старанна шукаем прычыны крызісу, які ахапіў нашу краіну,— і ў сталінізме, і ў застоі, і ў адсталасці палітычных структур. Між тым, корань усіх гэтых з'яў адзіны — адсутнасць належнай адукацыі ці, як вызначыў сённяшняе становішча спраў акадэмік Шаталін: «Некампетэнтны». Усе: ад кухаркі да міністра.

**Якую рэальную праграму выйсця з крызісу прапанавалі б Вы?**

— Няўважлівыя адносіны да вышэйшай школы — адлюстраванне грамадства, у якім доўгі час уладарыў ураўняльны падыход і да талентаў, і да пасрэднасцей на пару з грамадскай уласнасцю. Адукацыя была апошняй у ланцужку надзённых праблем. Розум кіраўніка зводзіўся да сілы яго ўлады. Куды там да духоўнасці, інтэлігентнасці і высокай адукацыі! Той жа самы кіраўнік і не заўважыў, як з элітарнай навучальнай установы, прызванай рыхтаваць спецыялістаў для навукі і культуры, універсітэты ператварыліся ў вытворцаў «паточных» інжынераў, і не стаў хвалявацца з нагоды астаткавага прынцыпу фінансавання адукацыі.

На жаль, у нашай краіне не было і не існуе дзяржаўнай праграмы, якая б дазволіла пазбегнуць катастрофы, падрыхтаванай на самым высокім узроўні. Калі звярнуцца да палітычных выступленняў, тэма належнай увагі да адукацыі сёння гучыць у іх, але, здаецца, да гэтае пары да канца неўсвядомлена.

Мы добра засвоілі — неадукаваныя, некультурныя людзі не могуць стварыць квітнеючую дзяржаву. Але каштоўнасць заўсёды мае нейкую вартасць — патрэбны сродкі. А доля грамадскіх выдаткаў з валавага нацыянальнага прадукту, якая выкарыстоўваецца сёння ў нас на адукацыю, складае 2,7 працэнта. У той жа час у Афрыцы — 5,4. У 1989—1990 гадах выдаткі на адукацыю ў ЗША павялічыліся ў 13,5 разы і дасягнулі 140 мільярдаў долараў. У нас аналагічныя выдаткі застаюцца на ўзроўні 1986 года.

А яшчэ ў 60-х гадах у ЗША была створана спецыяльная прэзідэнцкая камісія, якая высвятляла таямніцу касмічных дасягненняў савецкай краіны з разбуранай вайной эканомікай. Мы тады былі на трэцім месцы па каэфіцыенту інтэлектуалізацыі моладзі, сёння — на сорак пятым.

Непрадбачлівыя кіраўнікі, уклаўшы грошы, хацелі б праз год-два ўбачыць эканамічны эфект. Адукацыя — не меліярацыя. Сёння галоўнае — падрыхтаваць новае пакаленне больш высокага ўзроўню адукаванасці і культуры, прафесійнай кваліфікацыі.

**— Вы лічыце, ёсць рацыя жабрацкай краіне зноў пераразмяркоўваць сродкі, адбіраючы іх у якой-небудзь іншай галіны народнай гаспадаркі, якая, магчыма, пакутуе не менш, і вызначыць адукацыю як прыярытэтную галіну ў дзяржаўнай палітыцы?**

— З гэтага трэба пачынаць. Калі не знайсці сёння сродкаў на падтрымку вышэйшай школы і новых рэформ у адукацыі — ніякіх надзей на вызваленне ад эканамічнага прыгнёту і развіццё краіны не застанецца.

**— У Вас каля дваццаці папярэднікаў на пасадзе рэктара універсітэта. З чаго б пачыналі Вы, калі б давялося быць першым?**

— Мне, пэўна, было б намнога лягчэй, чым працягваць у сённяшніх умовах ужо пачатую справу. Не маючы «пасагу», я меў бы права дыктаваць свае ўмовы наконт падбору кадраў, студэнтаў, матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Чаго вельмі не хапае многім ВНУ? Сваёй школы. Выкладчыка, які працуе на ўзроўні сярэдняй школы, не параўнаць з прафесарам. Таму цяпер з асаблівай удзячнасцю ўспамінаю Антона Нікіфаравіча Сеўчанку, які загадзя паклапаціўся аб стварэнні універсітэцкай фізіка-матэматычнай школы вучоных.

Сёння ва універсітэце працуе 150 дактароў навук — прафесараў, звыш 1250 кандыдатаў навук.

Вучэбную і навуковую работу вядуць 9 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР. У аспірантуры вучацца 384 аспіранты і амаль 600 саіскальнікаў вучоных ступеняў.

За патрабаваннем культу вучобы стаіць не менш важнае — культу студэнта. Максімальнай увагі і даверу да яго, сатворчасці з ім. Многія спецыялісты адзначаюць, што апошнім часам непасрэдныя кантакты паміж студэнтамі і выкладчыкамі назіраюцца ўсё радзей. І гэты «люфт» у прафесійных адносінах пастаянна вядзе да перакосаў у педагагічным працэсе.

Толькі асобай можна ўздзейнічаць на асобу. Так што мы прыярытэтным для сябе абралі прынцып супрацоўніцтва выкладчыка са студэнтам.

Што ж датычыць матэрыяльна-тэхнічнай базы, прыкладам для пераймання я абраў бы Рурскі універсітэт у нямецкім горадзе Бохуме. Плошчы яго 500 тысяч квадратных метраў, у той час калі ў нас нямногім больш за 100. Нам 70 гадоў, а ім у мінулым годзе споўнілася 25. Яны стварылі базу за 10 гадоў, выдаткаваўшы 1,8 мільярдаў марак. А мы трэці год будуем адзін корпус у новым універсітэцкім гарадку. На святкаванне дваццаціпяцігоддзя Рурскі універсітэт наведалі прэзідэнт краіны і старшыня Бундэстага. Урад Германіі правільна вызначае прыярытэты: адукацыя — гэта аснова высокай якасці жыцця, крыніца эканамічнай магутнасці і бяспекі, творчасці ў мастацтве і літаратуры.

**— А колькі б Вам спатрэбілася мільярдаў, каб кіраваць па-сучаснаму абсталяваным універсітэтам?**

— Калі б нават мне выдзелілі сёння вялікую суму грошай — мы не знайшлі б ім прымянення. За рублі нельга набыць добрае абсталяванне. Па-першае, таму што яго няма, па-другое — калі яно ёсць, то далёка яму да належнага ўзроўню. Калі гаворка ідзе пра мільярды рублёў — яны не патрэбны. А вось за мільёнаў сто долараў можна нанова пабудаваць універсітэт.

**— Якія ўсё ж такі бачацца Вам перспектывы развіцця універсітэцкай матэрыяльна-тэхнічнай базы?**

— Самыя туманныя. Таму што адносіны да нас урада пакідаюць жадаць лепшага. Ёсць магчымасць парадаваць нас юбілейным падарункам — перадаць універсітэту будынкі былой вышэйшай партыйнай школы. На жаль, на сённяшні дзень рэалізацыя гэтай магчымасці вельмі праблематычная.

З будаўніцтвам новага гарадка ўсё было б нядрэнна, калі б не слабая база будаўнічай індустрыі. Будаўнікі не ў стане зрабіць больш, чым яны могуць. Не хапае ні матэрыялаў, ні людскіх рэсурсаў. Выдзеленыя грошы не асвойваюцца.

**— Многія, нярэдка таленавітыя, навучэнцы і педагогі пакідаюць сёння краіну. Ці хвалюе пытанне «ўцечкі мазгоў» рэктара вядучай ВНУ рэспублікі?**

— Зразумела, гэта вялікія страты для краіны. Калі штогадовы агульны выезд грамадзян СССР выйдзе за прагназіруемы ўзровень — 600 тысяч чалавек, яны складуць за бліжэйшае дзесяцігоддзе 1,1 мільёна спецыялістаў. Хоць і людзей можна зразумець — «там» вышэйшы ўзровень жыцця, больш магчымасцей праявіць сябе. «Уцечка мазгоў» у час сённяшняй эканамічнай разрухі — з'ява заканамерная.

Але ж і за мяжой многія ад'язджаюць у іншыя краіны, і лічыцца гэта нармальным.

**— Вы самі не раз наведвалі замежныя ВНУ. Ці змаглі б кіраваць работай адной з іх?**

— Безумоўна. Там кіраўніку нават лягчэй працаваць. Зламанае ў інтэрнаце крэсла наўрад ці трапляе ў поле зроку рэктара, які ў нас займаецца і рамонтам, і дастаўкай, і набыццём, і будоўляй. Там у кожнага свае кола абавязкаў.

**— Сярэдні конкурс ва універсітэце не з самых высокіх сярод рэспубліканскіх ВНУ. Ці «выгадны» універсітэт рэспубліцы?**

— Мне здаецца, пакуль ніхто яшчэ не падлічваў, але ж падрыхтоўка кадраў ва ўсім свеце лічыцца справай рэнтабельнай. І менавіта за выдатную падрыхтоўку спецыялістаў у студзені 1969 года БДУ быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Да таго ж, універсітэт яшчэ і буйны навуковы цэнтр. Многія праблемы, над якімі працуюць вучоныя, уваходзяць у агульнадзяржаўныя планы навуковых даследаванняў.

Ды і конкурс абітурыентаў неблагі, калі ўлічваць не толькі іх колькасць, але і якасць. Сярэдні бал на ўступных экзаменах у нас — 4,5. Я б не згадзіўся, што прэстыж універсітэцкага дыплома падае. За права атрымаць яго праз пяць гадоў вучобы змагаліся сёлета 4000 абітурыентаў, сярод якіх 1400 — медалістаў.

**— Большую частку свайго жыцця універсітэт пражыў з імем Леніна. Ці мэтазгодна мяняць яго на 71-м годзе?**

— Я думаю, у нас зноў пачалася кампанія. Па перайменаванню, якое іншы лічыць панацэяй ад усіх бед. Мы пакуль адклалі гэтае пытанне, каб абмеркавалі яго і выкладчыкі, і студэнты. Пройдзе час, і рашэнне будзе прынята на цвярозую галаву.

**— Фёдар Мікалаевіч, наш універсітэт — амаль равеснік савецкага грамадства. І разам з ім перажываў усе ўзлёты і падзенні. За якія старонкі яго гісторыі Вам як рэктару сорамна?**

— Я лічу, нам няма чаго саромецца. Універсітэт займаўся навучаннем і выхаваннем. Магчыма, яны былі заідэалагізаванымі. Але ж мы самі сябе падманвалі, самі верылі ў створаныя міфы.

Гутарку вяла
М. ЗАГОРСКАЯ.

## ПРОСТА УНІВЕРСІТЭТ...









А Ў ВАС? А Ў НАС!

# Свабода слова — першакурснікам!

**Універсітэту — семдзесят, першакурснікам — семнаццаць. Нягледзячы на адлегласць ва ўзросце, яны, здаецца, нядрэнна пасябравалі.**

У мінулую пятніцу, 25 кастрычніка, у памяшканні, дзе раней размяшчаўся тэатр «Хрыстафор», адзначаўся Дзень першакурсніка факультэта журналістыкі БДУ.

Урачыстую частку склалі віншаванні ў адрас першакурснікаў ад студэнтаў іншых курсаў.

Трэцякурснікі, напрыклад, адважыліся на стварэнне «славутага» ГКЧП (толькі ў маштабах аднаго факультэта), які звольніў дэкана Слуку «па хваробе».

Каб неяк выратаваць нашу эканоміку, супраць студэнта з шыльдачкай «Эканоміка» былі ўведзены на сцэну «танкі» (студэнты з шыльдачкамі «танкі»). Алегарычны путч, як і сапраўдны, скончыўся правалам.

Вядучы прадэманстраваў ружовыя мары першакурснікаў: дастаў з ружовага пакета залатую рыбку з паперы, якая нагадвала, хутчэй за ўсё, сушанага мутанта, і цыдулкі з пажаданнямі самім сабе.

Пасвячала ў першакурснікі Статуя Свабоды Слова — багіня журналістыкі. А трэцякурснік Сяржук Сянкевіч, у царкоўным хітоне, з уніяцкім крыжом, абмыў усіх свянцонай вадой журфакаўскіх крыніц.

У гэты вечар тэатрам эстрады быў паказаны мюзікл «Мядовы месяц для Золушкі».

Ягор КОНЕЎ,
студэнт факультэта
журналістыкі.

## ПЕРСПЕКТЫВА XXI СТАГОДДЗЯ

Перанясемся у новую краіну. Пакуль толькі ў думках. Пакуль толькі ў марах адчуем сябе сапраўднымі грамадзянамі сапраўды БЕЛАРУСКАЙ Беларусі. Няўжо паспеем яшчэ ўбачыць яе такой?..

Пётр Іванавіч ***БРЫГАДЗІН,*** прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце, лічыць, што, калі не ўсю рэспубліку, дык родны БДУ — паспеем. Бо ён, універсітэт, адукацыйны і культурны цэнтр, павінен паспяваць на два крокі хутчэй, чым усе астатнія.

Апошняе пасяджэнне Вучонага Савета, дзе абмяркоўваліся меры па выкананню Закона «Аб мовах у Беларусі» Беларускім дзяржаўным універсітэтам, прайшло з удзелам не толькі прыхільнікаў, але і праціўнікаў беларусізацыі. Тым не менш, меры прыняты да выканання, і шмат у чым яны прадугледжваюць сапраўдане абнаўленне нашай навучальнай установы.

Але не толькі дзякуючы гэтай акалічнасці глядзіць на даную праблему з аптымізмам прарэктар Брыгадзін...

Да вашай увагі — яго інтэрв'ю.

# ТАДЫ ЁН БУДЗЕ ХРАМАМ

**— Пётр Іванавіч, ці павінны мы весці гаворку, прысвечаную беларусізацыі, абавязкова на беларускай мове?**

— Я гатовы, калі ласка...

**— Гэтым пытаннем я хацела падвесці Вас да наступнага. Ці лічыце Вы абавязковай умовай «беларусізаванага» універсітэта тое, што ўсе тут пачнуць размаўляць выключна па-беларуску?**

— Не, я не думаю, што гэта абавязкова для ўсіх. Для адміністрацыі — так, бо асабісты прыклад заўсёды з'яўляецца моцным рухавіком. Але ў кожнага павінна заставацца права выбару.

**— А якім ўяўляецца Вам «беларусізаваны» універсітэт?**

— Перш за ўсё — установай высокаінтэлектуальных людзей. Я бачу гэта нават па-за сувяззю з мовай, хаця яна, як сродак зносін і як выражэнне нашай культуры, павінна абавязкова прысутнічаць. Без яе мы сябе, і не толькі сябе, збядняем. Я перакананы, што сёння мы павінны валодаць не толькі беларускай і рускай мовамі. Мы павінны ведаць мовы суседзяў — польскую, украінскую, літоўскую, а таксама мовы міжнародных зносін. Гэта стане рэальнасцю, калі адкрыюцца граніцы, будуць зняты абмежаванні на выезд, калі мы адчуем, што ўключыліся ў сусветную суполку. Тады не спатрэбіцца нікога прымушаць; веданне трох моў, як мінімум, стане такім жа натуральным, якім яно было для рускіх дваран.

**— Магчыма, тэрмін «беларусізацыя» непрымальны для Вас?**

— Ён застаўся нам ад 20-х гадоў, калі беларусізацыя ажыццяўлялася больш валявымі метадамі. Але сённяшнія прыёмы шмат у чым нагадваюць тыя... Мне не вельмі падабаецца гэты тэрмін. Працэс, пра які мы гаворым, я б назваў лепш развіццём нацыянальнай культуры, ці нацыянальным адраджэннем, ці фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці.

**— Сёння часта параўноўваюць наш час і 20-я гады з рознай нагоды. Тады беларусізацыю ажыццявілі ва універсітэце на 14 працэнтаў. Невыкананай засталася ў тым ліку і такая задача: да 1 кастрычніка 1926 года ўсе выкладчыкі, супрацоўнікі і асістэнты БДУ павінны былі вывучыць беларускую мову. Вы ўжо адзначылі, што тыя метады часта нагадваюць сённяшнія. Значыць, і вынік можа паўтарыцца... Дзе ж выратавальнае выйсце?**

— Я мяркую, выйсце — у большай варыянтнасці сённяшняга дня і ў менш жорсткіх умовах існавання. Тады нацыянальная беларуская інтэлігенцыя была нешматлікай. Усе выкладчыкі універсітэта запрашаліся з іншых мясцін. І было пэўнае глухое супраціўленне мерам па беларусізацыі БДУ. Сёння ж асноўная маса тых, хто працуе і вучыцца ва універсітэце,— карэнныя беларусы. Ім павінна быць лягчэй.

**— Сённяшні працэс беларусізацыі пачаўся ва універсітэце перш за ўсё дзякуючы з'яўленню Закона «Аб мовах...»?**

— Так, гэта быў моцны штуршок. Але і да яго рух ужо назіраўся. Памятаеце пастанову 1989 года аб руска-беларускім двухмоўі? Тады пачалі з'яўляцца розныя камісіі, было прынята рашэнне аб стварэнні беларускамоўных аддзяленняў. Без сігналу «зверху» было створана Таварыства беларускай мовы, якое сёння налічвае каля тысячы членаў, былі арганізаваны гурткі па вывучэнню беларускай мовы на многіх факультэтах, праводзіліся беларускія народныя святы дзякуючы намаганням энтузіястаў. Па ініцыятыве «знізу» было створана беларускамоўнае аддзяленне на гістарычным факультэце. Самі студэнты мехмата прапанавалі ўвесці для іх курсавы экзамен па беларускай мове — каб мець магчымасць выкладаць у беларускамоўных школах. І гэта не поўны пералік. Апошні прыклад — стварэнне «Хаўруса беларускамоўных студэнтаў БДУ».

Нават без уплыву Закона «Аб мовах...» сітуацыя кардынальна змянілася і працягвае мяняцца, адбываецца сапраўднае адраджэнне нацыянальнай ідэі. Меры, прынятыя на апошнім пасяджэнні Вучонага Савета БДУ, будуць садзейнічаць гэтаму. Галоўнае — навуковы падыход і паступовасць.

**— Ці знойдзецца ва універсітэце дастаткова прыхільнікаў менавіта такога падыходу?**

— Думаю, большасць схільныя ісці шляхам эвалюцыйных рэформ. Бо разумеюць: за кожным такім рухам — сотні, нават тысячы людзей.

Вось, напрыклад, адна з мер — стварэнне ў 1992 годзе беларускамоўных плыняў на геаграфічным, юрыдычным, фізічным, механіка-матэматычным, біялагічным і хімічным факультэтах. Справа не ў колькасці і не ў тэрмінах. Пачаць трэба з невялікіх аддзяленняў, няхай сабе па 30 чалавек. Тое ж самае — з пераходам да выкладання на беларускай мове ўсіх вучэбных дысцыплін на педагагічных аддзяленнях, а таксама на факультэце журналістыкі і юрыдычным, які плануецца ажыццявіць да 1996 года.

Але ж нас ужо крытыкуюць за тое, што не спяшаемся! На апошнім пасяджэнні Вучонага Савета выступаў старшыня камісіі, якая займалася праверкай выканання вышэйшымі навучальнымі ўстановамі рэспублікі Закона «Аб мовах...», ён прапанаваў ледзь не рэарганізаваць нашу ВНУ за тое, што адстаём ад іншых у справе беларусізацыі. А мы ж ні з кім не спаборнічаем! Спешка і імкненне да вынікаў любой цаной могуць зноў прывесці нас да зваротнага эфекту. Нам трэба памятаць не толькі пра паступовасць, але і пра дыферэнцыраванасць падыходу. Так, сёння цэлы шэраг курсаў трэба перакладаць не на беларускую, а на англійскую мову, бо на ёй прапануюцца апошнія навуковыя дасягненні многіх навук.

Я вельмі баюся прафанацыі. Столькі разоў нас ужо спрабавалі накіраваць сілком у рай. Паўтарэнне гэтага вельмі абразлівае для мяне асабіста.

**— Тым не менш, што Вы лічыце на сённяшні дзень дасягненнем у справе беларусізацыі універсітэта?**

— Самае істотнае — тое, што я ўжо адзначыў: змяненне агульнай атмасферы вакол гэтай праблемы. Магчыма, пералом яшчэ не адбыўся, але зрух адчуваецца.

**— А якім павінен быць наступны этап?**

— Ён прадугледжвае не толькі стварэнне падручнікаў і распрацоўку тэрміналогіі і методыкі выкладання. Перш за ўсё павінна сфарміравацца беларускамоўнае асяроддзе. Яно ўключае ў сябе і універсітэцкія інтэр'еры, і справаводства на беларускай мове, і далучэнне маладых да народных традыцый — далучэнне да культуры ў шырокім сэнсе. Я наогул у многім атаясамліваю далучэнне да нацыянальнага з эстэтызацыяй асяроддзя. Без нацыянальнай культуры не можа быць уваходжання ў культуру сусветную. Тым мы і цікавыя для «іх»...

**— Ці можаце Вы прадказаць, калі навокал будзе гучаць беларуская мова?**

— Пэўна, праз пакаленне. Мова таму і завецца матчынай, што павінна заставацца дзецям ад іх бацькоў. Вось калі нашы дзеці будуць гаварыць са сваімі па-беларуску, тады родную мову пачнуць выкарыстоўваць усе.

**— Менавіта тады наш універсітэт стане сапраўды нацыянальным?**

— Я перакананы, што яго можна лічыць нацыянальным ужо сёння. Калі меркаваць па патэнцыялу людзей, якія тут працуюць, па іх укладу ў развіццё навукі, культуры, адукацыі.

А вось Беларускі дзяржаўны універсітэт як эстэтычны, інтэлектуальны цэнтр — гэта, думаю, ужо перспектыва XXI стагоддзя. Менавіта тады ён, хочацца верыць, стане сапраўдным храмам, у тым ліку і знешне.

Гутарку вяла
**В. БЯГУН.**

## ЗАМАЛЁЎКІ З НАТУРЫ

# Парад студэнтаў

Універсітэт — гэта процьма студэнтаў, асоб і індывідуальнасцей. Цяжка ўявіць, наколькі адзін можа адрозніваццa ад другога. Мы вырашылі прадставіць вашай увазе некалькі аспектаў абагульненай намі асобы студэнта БДУ — 90-х.

Асоба СТУДЭНТА-ПАЛІТЫКА (амаль няўлоўная).

Добры прыклад — гэта наш з вамі сучаснік з чацвёртага курса гістфака Алесь ШАВЕЛЬ, адначасова старшыня дзвюх маладзёжных арганізацый — «Чырвонага Жонду» і «Хаўруса беларускамоўных студэнтаў БДУ». Малады чалавек, напэўна, страчаны для бестурботнай студэнцкай вольніцы, — непрыкрыты аматар беларусізацыі. Да палітыкі ў лік сваіх захапленняў далучаў маляванне, літаратуру, уласную генеалогію і інш. Асоба неакрэсленага маштабу. Адно з пытанняў інтэрв'ю, якое будзе надрукавана ў свой час:

— Алесь, як ты апынуўся ў эпіцэнтры падзей?

— Калі нельга перабудаваць усё грамадства, чаму б не паспрабаваць змяніць яго частку? «Чырвоны Жонд» меркаваўся як міні-грамадства са сваёй структурай улады...

Галоўнае, што «Хаўрус» падтрымлівае рэктарат і Вярхоўны Савет, інакш справа не мела б сэнсу...

Калісь Архімед прасіў кропку апоры. Ёсць дзве рэчы, на што абаперціся: улада і грошы...

Супрацьлегласць вечна занятага палітыка — СТУДЭНТ-ДАФЕНІСТ. Яго мы злавілі ў інтэрнаце:

— Тваё прозвішча?

— Адчапіся. Усё роўна не скажу.

— Чым думаеш займацца ў бліжэйшы месяц?

— Я так зусім не думаю. Я вось есці хачу.

— А потым?

— Перайду на канапу.

Тут аб'ект нечакана знік. Яго месца займае Лена К., філфак, СТУДЭНТКА-ВЫДАТНІЦА:

— Лена, колькі часу займае падрыхтоўка да заняткаў?

— Рыхтую толькі семінарскія, ды зрэдку пачытаю лекцыі. А вось надыход сесіі — гэта жах. З ранку да захаду сонца, а потым і ноччу. Галава ад ведаў пухне.

— Прафесійны сакрэт?

— П'ю непамерную колькасць кавы. Ведаю, што не на карысць здароўю...

— А як наконт вучобы ў час семестра?

— Самі паспрабуйце...

— Дзякуй.

З дыялога ў інтэрнаце (сапраўднасць гарантуецца). Сусед суседу:

— Люба, уяві сабе сярэднестатыстычнага студэнта. Які вынік?

— Худы, доўгі, акулярах і есці ўвесь час хоча.

— А як наконт разумовых вартасцяў?

—...? Зразумела, ты маеш на ўвазе СТУДЭНТА-ВУЧОНАГА.

Лабарант Віктар Ш., хімфак.

— Ты даўно ў лабараторыі?

— Яшчэ ў школе прыходзіў сюды займацца паралельна з заняткамі ў «Школе юных хімікаў». Каб паступіць на хімфак.

— Што будзе, калі раптам прыгатуеш не той раствор?

— Непрыемнасць будзе — мне ці начальству.

— Што самае непрыемнае ў тваёй працы?

— Халат адмыць не магу.

Такі вось атрымаўся парад. На наш погляд, у ім не хапае толькі студэнта-Дон-Жуана. Але, на жаль, злавіць яго мы не паспелі...

З зоркамі знаёміліся
Наталля ЖУК
і Таццяна КАЗАК.



## МЫ І СВЕТ

# Міжнародныя сувязі — глабальнае мысленне

Мае рацыю той, хто сцвярджае, што будучае чалавецтва, цывілізацыі не столькі ва ўмацаванні дзяржаўнасці, колькі ў інтэрнацыянальных сувязях. А сцвярджае так старшыня Дзяржадукацыі Генадзь Аляксеевіч Ягадзін.

Мы, з нашага журналісцкага пункту гледжання, адразу ж шукаем загвоздку: інтэрнацыянальныя сувязі, інтэрнацыяналізм, інтэрнацыянал.

Але прарэктар універсітэта па міжнародных сувязях Аляксандр Віктаравіч ШАРАПА прапануе іншы ланцужок асацыяцый: інтэрнацыянальныя сувязі, міжнародныя сувязі, глабальныя праблемы, глабальнае мысленне.

— Свет інтэгрыруецца. Ужо ніхто не выступае супраць адзінай эканамічнай прасторы ў Еўропе. І, я ўпэўнены, не пазбегнуць стварэння адзінай еўрапейскай адукацыйнай прасторы. Чаму б нам не ўвайсці ў яе? Ёсць жа прамая сувязь паміж адукацыяй, узроўнем культуры і свабодай чалавека.

**— А ці падрыхтаваны наш універсітэт да той ролі, якую Вы яму прапаноўваеце?**

— Хіба пагадненні аб супрацоўніцтве з замежнымі ВНУ васемнаццаці краін, у тым ліку ЗША, Германіі і Італіі, не доказ таму? Ды й сумесныя навуковыя даследванні з ВНУ - партнёрамі праводзяцца па 38 тэмах.

**— Калі мы гаворым аб міжнародным супрацоўніцтве, гэта ўсё ж успрымаецца як з'ява абстрактная. Што канкрэтна стаіць за гэтымі двума словамі?**

— Міжвузаўскае супрацоўніцтва, навукова-тэхнічныя сувязі і супрацоўніцтва з ВНУ замежных краін, абмен студэнтамі на безвалютнай аснове, камандзіраванне савецкіх спецыялістаў на доўгатэрміновую работу (2—3 гады) у замежныя ВНУ, прыём замежных спецыялістаў.

З 1986 па 1991 год універсітэт накіраваў на работу ў капіталістычныя, сацыялістычныя і былыя сацыялістычныя краіны з выкарыстаннем гэтых форм супрацоўніцтва 942 спецыяліста, 615 студэнтаў, улічваючы вытворчую азнаямленчую практыку, поўны курс навучання, пераддыпломную практыку і ўключанае навучанне. 48 спецыялістаў выехалі на доўгатэрміновую работу ў краіны, якія развіваюцца.

**— Якая ж «карысць» універсітэту ад таго, што той ці іншы папрацаваў за мяжой?**

— Вялікая, бо гэта дапамагае вырашаць больш паспяхова задачы і вучэбна-метадычнага, і навукова-даследчага характару. Скажам, вопыт асістэнта кафедры кібернетыкі факультэта радыёфізікі і электронікі І. М. Чушанкова, набыты ва універсітэце горада Карлсруэ (Германія) пры вывучэнні новай тэхналогіі ) галіне робататэхнікі дазваляе паспяхова выконваць дзяржбюджэтную НДР па тэме «Распрацоўка алгарытмаў у кіраванні робатамі павышанай хуткадзейнасці і дакладнасці».

Прозвішчы нашых спецыялістаў усё часцей становяцца вядомымі за мяжой. Прафесар Г. А. Браніцкі за вялікі ўклад у развіццё несрабранай фатаграфіі быў узнагароджаны фатаграфічным таварыствам ЗША медалём Козара. Прафесар І. К. Лапацін, які працуе на біяфаку, узнагароджаны ганаровым медалём «За выдатныя заслугі ў развіцці энтомафаўністыкі Цэнтральнай Еўропы». Аспірантка з філфакка Е. С. Суркова ўзнагароджана медалём міжнароднага фонду славянскіх культур і славянскай пісьменнасці.

**— А другі бок? Хіба замежных спецыялістаў не адпужваюць ні эканамічныя, ні палітычныя цяжкасці?**

— Не. Навука ж інтэрнацыянальная. Так сцвярджаюць амерыканскія вучоныя, якія пабывалі ў Мінску ў межах міжвузаўскага супрацоўніцтва: Джон Ні (Цэнтральны Мічыганскі універсітэт), Уільям Мэліас і Альфрэд Эванс (Каліфарнійскі універсітэт, Фрэсла). У час візіту Дж. Ні атрыманы дадзеныя аб новай тэхналогіі па стэрэалітаграфіі і па новых напрамках у галіне САПР у ЗША.

У. Мэліас перадаў просьбу найбольш аўтарытэтных колаў у сферы амерыканскага бізнесу штата Каліфорнія развіваць супрацоўніцтва з прамысловымі арганізацыямі, прадпрыемствамі і іншымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь.

Паспяхова дзенічае Беларуская Вышэйшая народная школа — Міжнародны экалагічны і культурны цэнтр. Летам гэтага года ў Мінску пачала функцыяніраваць упершыню ў Беларусі Міжнародная летняя школа беларускай мовы, літаратуры і мастацтва. У ёй прайшлі курс навучання слухачы з Германіі, Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Польшчы і іншых краін.

**— Доўгі час універсітэт рыхтуе кадры для замежных краін...**

— Дакладней, 30 гадоў. Выпускнікі БДУ працуюць больш чым у 80 краінах Еўропы, Афрыкі, Азіі і Амерыкі. Адзначу, што нашых выхаванцаў паважаюць у іх на радзіме. Дырэктарам інстытута матэматыкі ў Алжыры працуе Рабані Фузія. Яна ж абрана старшынёй Асацыяцыі матэматыкаў Афрыкі. Дырэктарам інстытута фізікі ў горадзе Канстанцына (Алжыр) працуе Халімі Рашыд. Намеснікам міністра адукацыі Гвінеі працуе Ібрагім Каліл Курума. Намесніка дырэктара інстытута хіміі Акадэміі навук Кубы — Арленда Рэйнас. Нгуен Нгон Фан доўгі час прадстаўляе В'етнам у ААН. Чан Дык Ван працуе дырэктарам інстытута матэматыкі ў Ханоі.

З большасцю сваіх выпускнікоў, якія працуюць за мяжой, універсітэт падтрымлівае пастаянныя кантакты: лісты, запрашэнні на кансультацыі, правядзенне сустрэч.

## НА БУДАЎНІЧАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ

# НАС УЖО НЕ СПЫНІЦЬ!

ЗАХАЦЕЛАСЯ, як у дзяцінстве, стаць уладальніцай чароўнай палачкі, калі Віктар Матвеевіч САПЕЛКІН, дырэктар аб'ектаў БДУ, якія будуюцца, разгарнуў схему новага універсітэцкага гарадка. Так прывабна на ёй усё выглядае і такім рэальным здаецца!

Уявіце сабе. Аднойчы прыгожым ранкам вы, як і ўчора, і месяц назад, выходзіце са станцыі метро «Шчамысліца». Накіроўваецеся ў вучэбны корпус свайго факультэта — калі вы студэнт ці выкладчык, або ў адміністрацыйны — калі займаецеся арганізацыяй работы універсітэта. Па дарозе сустракаеце знаёмага студэнта, які жыве ў адным з інтэрнатаў жылой зоны БДУ, і віншуеце яго з пераездам у адзначы пакой (у мінулым годзе ён жыў у двухмесным). Потым робіце камплімент выкладчыцы, якая цудоўна выглядае, бо паспела да пачатку заняткаў наведаць цырульню, размешчаную тут жа, у гарадку. І, нарэшце, вітаеце аспіранта, які толькі што, як заўсёды, праверу сваю маленькую дачку ва універсітэцкі дзіцячы садок. На вялікім перапынку вы плануеце схадзіць на пошту, каб павіншаваць бацькоў з Калядамі, і ў паліклініку — даўно ўжо збіраліся набыць паўгадавы абанемент у масажны кабінет. Паспееце! Бо ўсе універсітэцкія будынкі размешчаны шчыльна — далёка ісці не трэба...

Гаварыць, марыць карысна. Але мары хутка стамляюць, калі паміж імі і рэальнасцю занадта ўнушальная адлегласць. На схеме новага універсітэцкага гарадка яна не вызначана. Колькі чакаць — вядома толькі прыкладна. А вось чаго чакаць — гэта ўжо не таямніца.

Згодна з планам, універсітэт стане навасёлам у 2005 годзе, калі будзе завершана будаўніцтва яго новага комплексу. Гэты тэрмін — з пастановы Савета Міністраў БССР, якая была прынята ў 1987 годзе, а пачала выконвацца толькі ў 1989-м. Значыць, да лічбы 2005 трэба дадаць не менш чым два гады. І гэта не ўсё. Пэўна, яна яшчэ павялічыцца ў той жа прапорцыі, у якой будуць расці цэны на будаўнічыя матэрыялы, абсталяванне і працоўныя рукі. Прапорцыя абяцае быць паграждальнай...

Але Віктар Матвеевіч упэўнены: тыя аб'екты, якія ўжо будуюцца, не спыніць. Гэта — інтэрнат на 1000 месц, корпус біялагічнага факультэта, сталовая на 500 месц, канструктарскае бюро спецтэхнікі. Распрацавана дакументацыя на будынак факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, яго пачнуць узводзіць у будучым годзе, разам з корпусам падрыхтоўчага факультэта.

Гэта не спыніць! Але ж усё астатняе — таксама. І не толькі таму, што яно ўжо існуе на схеме. 140 гектараў, на якіх размесціцца новы універсітэт, сапраўды ў руху: сюды пойдзе цеплавая ветка ад ТЭЦ-4; зменіцца нават маршрут 47-га аўтобуса, хоць для гэтага прыйдзецца пераkладаць газавыя трубы пад дарогай і будаваць прыгяг самой дарогі да вёскі Шчамысліца. І тыя аб'екты, якія пакуль толькі ў «папяровай» распрацоўцы, таксама ўжо існуюць — мноства людзей дэталёва абмяркоўвалі ўсе іх, каб ажыццявіць. Хутка перайдуць з паперы на падмуркі бібліятэка на 3 млн. тамоў, вылічальны цэнтр, адміністрацыйны корпус, будынак механіка-матэматычнага факультэта, НДІ ядзерных праблем, аб'екты жылой зоны (так-так, тыя самыя інтэрнаты з адна- і двухмеснымі пакоямі, цырульня, пошта, дзіцячы садок...), гараж, склады і іншыя гаспадарчыя пабудовы.

Універсітэт мае будучыню не толькі ў Шчамысліцы. Бліжэйшым час павінен падарыць яму біялагічную станцыю на Нарачы, пансіянат для прафесарска-выкладчыцкага саставу ў раёне Аксакаўшчыны, спартыўны і піянерскі лагеры на Вілейскім вадасховішчы, а таксама яшчэ адзін спартыўны комплекс. Больш дробныя і больш блізкія змены — рэканструкцыя старога фізічнага корпуса, узвядзенне стадыёна і трыбун у спорткомплексе па вуліцы Кастрычніцкай, інжынернае забеспячэнне вучэбнай гаспадаркі «Шчамысліца» (дакладней, усебаковае добраўладкаванне самой вёскі).

Гарантыі — у лічбах. На будаўніцтве універсітэта ў бягучым годзе трэба было асвоіць 9,6 млн. рублёў. За 9 месяцаў гэты план выканаены напалову. І гэта поспех, бо ўвесь мінулы год прынёс толькі 10 працэнтаў. Будучы рыхтуе новую лічбу — 17 млн. рублёў. Праўда, з улікам старых цэн і без уліку знікнення былых вытворчых сувязей, якія распадаюцца разам з СССР. Цэмент і вадаправодныя трубы ўжо «затрымліваюцца» на Украіне, на чарзе — іншыя цяжкасці і праблемы.

Але ў нас ёсць узоры іх пераадолення. Дастаткова ўспомніць спрэчкі, амаль бойкі, вакол дубравы. Перамога атрымана — дуброва будзе належыць біялагічнаму факультэту, цяпер вакол яе ўзводзіцца надзейная агароджа даўжынёй 2,5 кіламетраў, на якую спатрэбіцца 240 тон металу. Будынак НДІ ядзерных праблем, які з'явіцца ў ліку іншых аб'ектаў новага комплексу, таксама паспяхова «адваявалі». Што далей? Іншага шляху ў нашым грамадстве, на жаль, пакуль няма. Толькі з дапамогай асабістых сувязей, моцных рук і гучнага голасу...

Між тым, ёсць у нас і іншыя аргументы. Слова «БДУ» так сугучна корню дзеяслова «будаваць», што універсітэт проста асуджаны на поспехі ў гэтай справе. Нічога, што атрымалася затрымка працягам роўна ў 70 гадоў. Такі ўзрост — гэта ўжо заслужанае права на спакойную старасць, у тым ліку на добраўпарадкаванае і сучаснае жыллё.

Дарэчы, падарунак да юбілею ёсць. Якраз напярэдадні 30 кастрычніка пачалося будаўніцтва дома па вуліцы Варанянскага, у якім 72 кватэры — для выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ. Палову з іх — 36 — плануецца здаць пад ключ прыкладна праз год.

В. БЯГУН.

## ВЕЦЕР ВАНДРАВАННЯЎ

# Хроніка жыцця

Мала хто з сапраўдных вандроўнікаў любіць многа гаварыць пра сваепадарожжы. Звычайна расказы гэтыя такія ж кароткія і простыя, якімі выглядаюць турысцкія маршруты, калі вывучаць іх па карце. А калі ўявіць на самой справе...

Напэўна, вы пераканаецеся ў гэтым, пазнаёміўшыся з кароткай гісторыяй клуба вандроўнікаў і альпіністаў БДУ, якому толькі што споўнілася 33 гады.







ЖНІВЕНЬ 1958 ГОДА. Выкладчык матэматыкі Анатоль Фядэнка са студэнтамі робіць паход у Прыэльбруссе, Цэнтральны Каўказ. Маладыя вандроўнікі аб'ядноўваюцца ў клуб.

ЛІПЕНЬ 1963 ГОДА. Анатоль Фядэнка са сваімі таварышамі ўпершыню праходзіць складанейшы ледаспад Сарыхадан у Фанскіх гарах на Гісар-Алаі. Чатыры гады раней Сарыхадан штурмавалі масквічы, але беспаспяхова.

ДРУГАЯ ПАЛОВА 60-Х ГАДОЎ. У клубе бурна развіваецца альпінізм, водны турызм, горналыжны спорт.

САКАВІК 1971 ГОДА. У Саянскіх гарах знікае пад снежнай лавінай любімы ўсімі беларускі бард Арык Круп і некалькі яго таварышаў. Самыя моцныя альпіністы універсітэцкага клуба адразу выходзяць на пошукі загінуўшых.

ЛЮТЫ 1973 ГОДА. Клуб праводзіць 1 фестываль аўтарскай песні. З гэтага часу фестываль становіцца традыцыйным і праходзіць кожныя два гады.

ЖНІВЕНЬ 1976 ГОДА. Першы паход на веласіпедах па Крыму і Каўказу.

ВЕРАСЕНЬ 1982 ГОДА. На факультэце грамадскіх прафесій адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы інструктараў па турызму. За дзевяць гадоў работы пасведчанні інструктараў атрымалі 246 студэнтаў універсітэта. Аляксандр Ганчароў — нязменны кіраўнік курсаў.

ЛІПЕНЬ 1983 ГОДА. Уладзімір Сіроцін з камандай падымаецца на адну з самых складаных вяршыняў Каўказа — гару Ушбу.

ЖНІВЕНЬ 1983 ГОДА. Людміла Прывалава ў саставе зборнай каманды г. Мінска становіцца чэмпіёнкай СССР у спаборніцтвах па тэхніцы пешага турызму ў Раўбічах.

ЧЭРВЕНЬ 1987 ГОДА. Студэнтка механіка-матэматычнага факультэта, самы папулярны бард клуба Алена Алексяёнак становіцца лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу выканаўцаў аўтарскай песні.

ВЕРАСЕНЬ 1988 ГОДА. Драматычныя падзеі чэмпіяната СССР па альпінізму ў класе траверсаў (праходжанне некалькіх вяршынь без спуску ўніз), Заходні Памір. З-за штармавога ветру і снегападу ўсе каманды ідуць уніз. Адзіная ў гэтым сезоне каманда Беларусі праходзіць маршрут і становіцца чэмпіёнам СССР. Касцяк каманды склалі альпіністы універсітэцкага клуба.

КРАСАВІК 1989 ГОДА. Юрый Віслаус здымае першы відэафільм аб лыжным паходзе на Зямлю Франца-Іосіфа. Фільм паказаны па Цэнтральнаму тэлебачанню ў «Клубе падарожнікаў».

ЛІПЕНЬ 1990 ГОДА. Кірыл Пінчук і каманда пад яго кіраўніцтвам праходзяць на байдарках па Белым моры вакол Салавецкіх астравоў.

ЖНІВЕНЬ 1991 ГОДА. Зборная каманда клуба штурмуе адну з самых высокіх вяршынь СССР — пік Леніна (7134 м) і дабіваецца поспеху.

## ВЫХОЎВАЕЦЦА ЭЛІТА

# Школа пад назвай «ліцэй»

ВЫ ВЕДАЕЦЕ, што ў Мінску наогул няма ліцэяў? Гэтую назву можа прысвоіць толькі Саўмін, але ён гэтага не робіць. Таму ўсе нашы так званыя ліцэі — гэта проста школы «з ухілам». Адна з іх, аб якой пойдзе размова,— гэта Мінская спецыялізаваная школа пры БДУ імя У. І. Леніна. Мікалай Валяр'янавіч КНЫШ, намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце, які расказаў мне пра жыццё ліцэя, пераканаены, што тут гартуецца светлае будучае беларускай навукі і інтэлігенцыі. Кім жа яшчэ могуць стаць выхаванцы, якія атрымалі амаль усе прызавыя месцы на рэспубліканскай алімпіядзе?

Навучальная праграма ў ліцэі (будзем і мы зваць яго так, хаця б неафіцыйна) скіравана на падрыхтоўку да паступлення ў БДУ. Пашырана вывучаюцца фізіка, матэматыка, філалогія. Акрамя звычайных заняткаў, у ліцэі праводзяцца спецкурсы і спецсемінары, дзе ёсць магчымасць максімальна заглыбіцца ў невялікі адрэзачак праграмы, захапіць тое, што ў звычайнай школе не пачуеш нават на факультатыве — напрыклад, пра родны фальклор ці абрады.

У гэтым годзе ліцэй падрыхтаваў першы выпуск. Вынікі: 95 працэнтаў выпускнікоў паступілі ў БДУ, астатнія 5 працэнтаў апынуліся ў іншых навучальных установах, узровень якіх нават па чутках вышэй за сярэдні.

Чаму гэта адбываецца? Проста ліцэіст, які набраў на выпускных іспытах у ліцэі максімальна балаў, адразу прымаецца ва універсітэт. Калі атрыманыя адзнакі крыху ніжэй за выдатныя — тады ўжо яны будуць параўноўвацца з прахадным балам ва універсітэце. У час залічэння пры аднолькавай колькасці балаў перавагу мае ліцэіст, бо на іспытах выкладчыкі БДУ адзначаюць узровень адукацыі.

У чым сакрэт такой эфектыўнасці навучання? Напэўна, у зацікаўленасці ліцэістаў у выніках вучобы. Яны не жадаюць губляць свой шанц. Каб паступіць сюды, трэба прайсці ўступныя іспыты, і конкурс звычайна бывае ад трох да пяці чалавек на месца. Таму прыходзіць моладзь таленавітая, з багатымі ведамі. Да таго ж, ліцэй ганарыцца сваімі кадрамі. Тут працуюць выкладчыкі кафедраў БДУ, для якіх праца ў школе лічыцца звычайнай пагадзіннай нагрузкай. Аднак тут яны могуць ператварацца нават у класных кіраўнікоў. Школа ёсць школа, хай сабе і такая незвычайная.

Мікалай Валяр'янавіч лічыць, што той неад'емны ўжо элемент дэмакратызму, які стаў нормай, пахodзіць ад педкалектыву. Выкладчыкі разумеюць сваіх вучняў. Аб тым, што настаўніку хочацца ісці на працу, мне пашчасціла пачуць толькі ў ліцэі. Мікалай Валяр'янавіч чулліва ўспамінаў атмасферу зацікаўленасці, якая звычайна пануе ў класе. Вучнямі кіруе цікавасць, да таго ж, іх узровень часам не ніжэй, чым у выкладчыка — ёсць з кім па-сяброўску паспрачацца наконт марфемы, напрыклад, і нават рызыкнуць разысціся ў меркаваннях наконт гэтай важнай для філолага дробязі.

Мікалай Валяр'янавіч разам са сваімі былымі вучаніцамі, цяперашнімі студэнткамі філфака Наташай Баранавай і Вольгай Насякайла заглыбіліся ў агульныя ўспаміны, прыгадваючы найбольш забаўляльныя эпізоды, а на мяне павявала цёплай і нейкай братэрскай атмасферай гэтага прытулку навук. Пасля такой размовы разумееш, чаму ў Англіі гальштук ад формы выхаванца Оксфарда можа захоўвацца да сівых валасоў яго ўладальніка. «Мы жывём, як сям'я», — дапамог перакласці мае пачуцці на мову Мікалай Валяр'янавіч. Прыгажосць настаўніка, лічыць ён, пачынаецца з прафесіяналізму, уключае ў сябе чалавечыя якасці і акцёрскія даныя. Усё гэта ў сукупнасці дае тую якасць выкладання, калі вучань цалкам задаволены настаўнікам.

«Што каштоўнага вы набылі ў ліцэі?» — запыталася я ў дзяўчат. «Мы ўсё пакінулі тут», — пачула загадкавы адказ. У ліцэі былцам бы засталася іх душа — разам з любімымі настаўнікамі, сябрамі, ліцэйскімі вечарамі. На жаль, яны не знайшлі таго ж на факультэце. Таму не дзіўна, што былыя вучні часта прыходзяць у ліцэй, як у родны дом, дзе без іх сумуюць, як мне сказалі, настаўнікі.

Ніводная справа не можа абысціся без праблем. Ёсць яны і ў ліцэя: за паўтары гады «вымальваннях» школа атрымала памяшканне, і шчаслівыя ліцэісты могуць займацца ўсе разам. Нічога, што ў бібліятэцы не хапае метадычнай літаратуры, а ЭВМ не ўстаноўлены, што працягваецца бясконцы рамонт з недахопам будматэрыялаў, — затое не «ў прымах». Праўда, падсілкавацца на вялікіх перапынках вучні бягуць у суседнюю школу № 55.

А чым дапамагае універсітэт? Ён дае магчымасць працаваць ліцэістам у лабараторыях, бо тэхнічная база школы слабая, забяспечвае школу кадрамі. Калектыў выкладчыкаў стабільны, і ніхто з іх яшчэ не пайшоў з ліцэя па сваёй ахвоце.

Ліцэй стаў своеасаблівым пасрэднікам паміж школай і БДУ. Яго збіраюцца паступова беларусізаваць. Напэўна, заўтрашні дзень рэспублікі будзе рыхтаваць навучальнымі ўстановамі такога тыпу, у якіх здольны выхоўваць высокія чалавечыя якасці, адчуванне сяброўства, цікавасць да працы вучобы.

Н. ЖУК.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

31 кастрычніка
Зак. 2077.
Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.